ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЯ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 62 (444) Нядзеля 5 чэрвеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у СЕРАДУ, ПЯТНІЦУ І НЯДЗЕЛЮ | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

Усім акругкомам ЛКСМБ

Згодна пастановы апошняга пленуму ЦК ЛКСМБ прапануецца на ўсіх раённых конфэрэнцыях ЛКСМБ паставіць унечарговы даклад аб узмацненьні распаўсюджаньня газэты «Чырвоная Зьмена»

Зьніжэньне ня спыняецца

Першага чэрвеня—гэта быў кантрольны дзень, у які загад саюзнага Ўраду аб зьніжэньні цэн на 10 проц. павінен быць выканан.

На 1 мая мы мелі зьніжэньне цэн у сярэднім па ўсім БССР ад 7 да 8 процантаў. Матар'ялы, атрыманыя з месц значна пазьней, гаворацъ аб тым, што ў вясковых мясцовасьцях некаторых акруг размер зьніжэньня набліжаецца да 10 проц.

Важна ня тое, што цэны зьнізяцца ў сярэднім па ўсім Саюзе на 10 пр. Справа ў тым, што да кампаніі цэны ў розных мясцох Саюзу былі на розным ўзроўні. Такім чынам нам трэба дасягнуць не сярэдняга ўсесаюзнага 10-ці процантнага зьніжэньня, а канкрэтнага вырашэньня задачы прыстасоўваючы яе да ранейшых цэн—у БССР.

Прымаючы пад увагу, што цэны ў БССР і раней былі крыху ніжэй, чым у іншых мясцох СССР і надбаўкі ў нас устаноўлены таксама меншыя, чым у іншых мясцох СССР, зьніжэньне ў БССР на 10 проц. з пункту погляду сярэдняй лічбы па ўсім Саюзе не дало-бы патрэбных вынікаў.

З прычыны гэтага мы разглядаем посьпехі зьніжэньня з пункту погляду выконваньня гранічных надбавак. Даныя, якія мае Наркамгандаль, гавораць за тое, што цэрабкопы, за некаторым выключэньнем, гранічныя надбаўкі захоўваюць. Тое самае нагляаецца ў спажывецкай коопэрацыі мястэчак. Гранічныя надбаўкі ў большасьці ня выконваюць дробныя вясковыя спажывецкія таварыствы і асабліва сельска-гаспадарчая коопэрацыйная сетка.

Зразумела, і тыя коопэрацыйныя організацыі, якія маюць бязумоўныя дасягненьні, не пазбаўлены некаторых недахватаў: яшчэ вельмі вялікія гандлёвыя выдаткі, яшчэ слаба праводзіцца рацыяналізацыя апарату.

На першага чэрвеня гранічныя надбаўкі ў БССР даведзены да гранічных надбавак, устаноўленых Наркамгандлем. Зьніжэньне цэн у вясковых мясцовасьцях набліжаецца да 10 процантаў. Мы, аднак, не павінны застанавіцца на гэтых дасягненьнях. Зьніжэньне цэн на гэтым ня спыняецца, бо праблема зьніжэньня розьнічных цэн яшчэ ня вычарпана.

Комсамольскім організацыям, якія да апошняга часу ня сумелі шырока паставіць удзел працоўнай моладзі ў зьніжэньні цэн,—трэба зьнішчыць гэты недахоп.

Шлях да гэтага—праз дапамогу далейшаму зьніжэньню накладных выдаткаў і рацыяналізацыю гандлёвага апарату.

Пасьля навальніцы нот і ультыматумаў.

Парвалі.

Пленум Выканкому Камінтэрну

Агалошана «апавяшчэньне аб працы пленуму Выканкому Камінтэрну» за подпісамі політычнага сакратара выканкому Камінтэрну.

У апавяшчэньні зазначана: з 18-га да 30-га мая пасядаў пленум Выканкому Камінтэрну. Праца пленуму, які сабраўся ў пераломны момант разьвіцьця міжнароднае рэволюцыі, мела выключнае значэньне для рэволюцыйных рабочых усіх краёў.

Першым пытаньнем пленум абмеркаваў задачы Комінтэрну ў барацьбе проці вайны і ваеннае небясьпекі (па дакладах Куусінена, Бела, Бэрнара). Пленум зазначыў, што галоўнаю небясьпекаю ў сучасны момант зьяўляецца вайна капіталістычнага сьвету на чале з Англіяй проці СССР і рэволюцыйнага Кітаю. Пленум ухваліў адозву ў зьвязку з разрывам зносін між Англіяй і СССР.

Шырока абмяркоўваліся пытаньні кітайскае рэволюцыі па дакладу Бухарына. Пленум узяў курс, каб абярнуць уханскі ўрад Гаміндану ў рэволюцыйна-дэмократычную дыктатуру рабочых і сялян.

Па пытаньні аб задачах кампартыі Англіі (даклад Кэмпбэля) пленум даў ацэнку становішча Англіі і вызначыў задачы кампартыі Англіі ў сучасны момант.

Пленум ухваліў склікаць чарговы шосты сусьветны конгрэс улетку 1928 году.

Зьезд моладзі Чэха-Славакіі.

Перамога адзінага фронту.—У зьезьдзе ўдзельнічалі комсамольцы, соцыял-дэмократы і беспартыйныя.

Адбыўшыся ў нядзелю зьезд рабочай моладзі выклікаў вялікае хваляваньне ў рэформісцкіх (згодніцкіх) колах, якія чынілі ўсялякіе перашкоды ўдзелу ў зьезьдзе моладзі, прымыкаючай да рэформісцкіх організацый.

На зьезьдзе прысутнічала 297 рабочых і работніц, з іх 214—дэлегаты ад прадпрыемстваў з рашаючым голасам. У спрэчках выступілі 88 комсамольцаў, 22 соцыял-дэмократы, 13 сяброў рэформісцкіх профсаюзаў, 27 беспартыйных і інш.—усяго 127 чалавек.

Зьезд прашоў пад камуністычным лёзунгам „Супроць капіталістычнай рэакцыі“, „Супроць рыхтуючайся вайны“, „Супроць пазбаўленьня салдат выбарчых праў“, „За агульную барацьбу супроць фашызму“.

Абраны камітэт дзейнасьці. Зьезд паслаў прывітаньне працоўнай моладзі СССР.

Кампанія „Рукі прэч ад Кітаю“.

Адзін член КСМ, які распаўсюджваў у Нью-Ёрку лістоўкі супроць зыступленьняў імпэрыялістых у Кітаі, быў арыштаваны. У турме поліцыя жорстка зьбіла гэтага комсамольца, а потым прыгаварылі да 6-ці месяцаў турмы.

Адначасова з ім быў арыштаваны яшчэ другі малады рабочы, які, ня гледзячы на тое, што закон дапушчае вызваленьне на парукі, ня быў вызвалены, хоць ён і прапанаваў унесьці належны залог. МОПР заняўся гэтым пытаньнем

БЮРОКРАТЫЗМ--У ШТЫКІ

ЗАДАЧА: Дабіцца зьнішчэньня бескарыснага „вандраваньня“ па паперам.— Палепшыць працу ўстаноў

Ці выдавецтва гэта? Як выраслі штаты?

На аднэй культнарадзе пры ЎсеЦСПС тав. Томскі гаварыў, што цяпер у нас розных выдавецтваў, як грыбоў пасьля дажджу, што кожны губпрофсаюз лічыць патрэбным мець свае выдавецтва.

Не адставаць жа і нам.

На Інтарнацыянальнай і Ленінскай вуліцах паявіліся шыльды:

Рэдакцыйна-выдавецкі аддзел ЦСПСБ

Новая ўстанова паявіўшыся ў Менску хутка распрацавала плян працы.

Рэдакцыйна - выдавецкі аддзел быў вызначан абслугоўваць нашы профэсыйныя організацыі профлітаратурай, выданьнямі на беларускай мове.

Справа добрая і патрэбная.

Але.. але...

Апарат гэтага аддзелу як сьнежны комік пачаў расьці. Раней 2 чалавекі... 3... потым ужо 4!..

За 25-26 год рэдакцыйна-выдавецкі аддзел ЦСПСБ выпусьціў 34 новыя выданьні. За 26-27 год толькі яшчэ 4.

Зьявіліся крама, кантора, склад. У апараце ўжо 10 чалавек. Рост... самы запраўдны. Прычым рост ішоў галоўным чынам за лік «сваячкоў»..

РСІ нядаўна падвозіла вынікі дзейнасьці гэтага аддзелу.

Вывілася, што ва ўсёй прадажы ўласная літаратура мае месца толькі на 2,6 проценты, пры выдатках у 10.3 проц. са абароту.

Аддзел заняўся агульнай гандлёвай дзейнасьцю і адышоў ад сваіх прамых абавязкаў.

78 процантаў са ўсёй прадажы складаюць канцэлярскія прылады. Між іншым трэба сказаць, што за гандаль канцэлярскімі прыладамі бяруцца ўсе дэфіцытныя ўстановы, бо тут яны маюць магчымасьць рабіць надбаўкі да 18 проц.

РСІ гандлёвую дзейнасьць канцэлярскімі прыладамі выдавецтва спыніла. Апарат скарочан з 10 да 4 чалавек.

Засталася толькі адна зачыненая база.

Той самы.

Тры рублі настаўніцы Альшэўскай.

Самых лепшых думак была школьная работніца тав. Альшэўская аб сваім саюзе Працаўнікоў Асьветы, калі ў адзін прыгожы дзень яна атрымала абвестку аб тым, што яна выклікаецца ў Менск на ўрачэбна-кантрольную камісію для агляду яе здароўя. У абвестцы паведамлялася, што ў выпадку неабходнасьці яна будзе паслана ў дом адпачынку, а мабыць, нават і на курорт.

«Вось добры саюз»--раздумвала Альшэўская, едучы ў вагоне цягніка з Койданава ў Менск. У вагоне яна з пасажырамі аб адным толькі і размаўляла, як аб вялікай ролі профсаюзу, яго значэньні для працоўных і г. д.

Але прыехаўшы ў Менск і пабыўшы на ўрачэбна-кантрольнай камісіі яе погляды пачалі хістацца. Добрыя думкі аб саюзе сталі зьмяняцца іншымі.

Прычынаю ўсяго гэтага было тое, што Альшэўская папала ў кругаварот бюрократычных калідораў.

Пачалося з заявы, якую напісала Альшэўская ў саюз з просьбай выплаціць ей грошы за праезд. Усяго 3 рублі.

У ЦП саюзу прачытаўшы заяву напісалі адносіну ў Менскую акрстрахкасу

Акрстрахкаса наклаўшы рэзолюцыю на адносіне ЦП саюзу адаслала Альшэўскую за атрыманьнем грошай да койданаўскага ўпаўнаважанага Страхкасы.

Упаўнаважаны сустрэў Альшэўскую прыветліва, але грошай ўсё-ж такі ня даў. Ён адказаў, што грошай няма...

Альшэўская зноў у саюзе.

Саюз парашыў звараціцца ў аддзел аховы здароўя (Рабмэд) з адносінай, поўнай абурэньнем. Паміж іншым у адносіне пісалася, што «трэба гэтую справу ўпарадкаваць, бо такая валакіта вельмі непажадана».

Добра, што ў саюзе ўжо ўразумелі, што гэта валакіта... Але яшчэ ня ўразумелі, што яны самі зьяўляюцца таксама ўдзельнікамі гэтай валакіты.

Адносіна на працаўнікоў з аддзелу аховы здароўя не аказала належнага ўплыву. Адказ, які яны паслалі ў саюз быў кароткі «грошай даць ня можам».

Атрымаўшы такі адказ, галовы працаўнікоў ЦП саюзу асьвятліліся геніяльнай думкай:—Ці ня спыніць нам усю гэтую валакіту і ці не заплаціць Альшэўскай 3 рублі? Грошы невялікія!

Даўно-б так...

Р. Г-н.

ГЭТА БУДЗЕ НАВУКАЮ ІНШЫМ

ВОПЫТ МАГІЛЕЎСКАГА КОНКУРСУ НА ЛЕПШУЮ ЯЧЭЙКУ

Конкурс выявіў, што найбольш дасягненьняў **маюць ячэйкі ў справе паляпшэньня комсамольцамі сваіх гаспадарак.** Усьлед затым ідуць посьпехі на фронце **коопэрацыі, у галіне ўзмацненьня працы сельсаветаў і камітэтаў, організацыі пажарных дружын, пачынкі мастоў, дарог, ажыўленьне працы грамадзкіх організацый і г. д.**

Слабей, а ў некаторых выпадках і зусім не праяўлялі ячэйкі сваёй ініцыятывы ў напрамку **разьвіцьця колектыўных форм гаспадараньня організацыі машынных таварыстваў, сельска-гаспадарчых і малочных арцеляў і інш. Мала,** зусім мала зроблена ў справе **мэліорацыі.** Ня зусім добра абстаіць справа з ажыўленьнем работы сельсавецкіх камісій.

Тыя, што атрымалі прэміі

Конкурсная камісія прысудзіла прэміі **Задубскай** ячэйцы Кармянскага раёну і **Ямніцкай**—Быхаўскага раёну.

Што-ж ёсьць у іх рабоце такога, чаму могуць навучыцца іншыя ячэйкі? **Задубская ячэйка** у якой **гаспадарчая работа** займае першае і пачэснае **месца, атрымала першую прэмію за тое, што змагла практычна знайсьці спосабы ўвязкі асабістай зацікаўленасьці комсамольцаў у палепшаньні сваёй гаспадаркі з агульнымі задачамі соцыялістычнага будаўніцтва.** Гэта ўвязка выявілася ў **організацыі сельска-гаспадарчага таварыства і шэрагу дадатковых вытворчых аб'яднаньняў, з уцягненьнем у іх большасьці беднаты, утварэньні машыннага таварыства і значнай працай па коопэрыраваньню насельніцтва.**

Апрача таго, ячэйка дабілася паўных дасягненьняў у ажыўленьні савету і яго камісій. Так, напрыклад, **па ініцыятыве ячэйкі пленум сельсавету абгаварваў падрабязговы плян новых гаспадарчых пачынаньняў па вёсках сельсавету, культкамісія праводзіла масавы збор падпіскі на газэты і г. д.**

Ямніцкая ячэйка, акрамя таго, што значна палепшыла работу **камітэту** і высунула з сваіх шэрагаў некалькі актыўных грамадзкіх працаўніц з дзяўчат, **сумела як належыць узяцца за мэліорацыю.**

Комсамольцы з гэтай ячэйкі зьяўляюцца старшынямі ў двух мэліорацыйных таварыствах. 10 комсамольскіх гаспадарак—актыўныя ўдзельнікі ў мэліорацыйнай працы.

На першых заваёваных 30 дзесяцінах балота заклацзен паказальны вучастак.

Гэта, бязумоўна, вялікае дасягненьне ямніцкіх комсамольцаў. Так і другім ячэйкам з усім сялянствам трэба вырашаць пытаньні паляпшэньня вясковага жыцьця.

Кажуць аб шляхох да дасягненьняў.

Конкурс скончыўся. Трэба цяпер дабівацца таго, **каб абмен вопытам комсамольскай працы стаў справай не кампанейскай, а штодзённай.**

Паказаць не толькі свае дасягненьні, але і **шлях да перамогі**—вось тая чарговая задача, якая стаіць перад вясковымі комсамольскімі ячэйкамі.

Дзе мы кульгаем?

Але-ж было-б памылкова ня бачыць за гэтымі добрымі бакамі і шэрагу слабых старонак нашай работы, з якіх павінны быць зроблены адпаведныя вынікі ў рабоце організацыі. К слабым старонкам, выяўленым конкурсам, патрэбна аднесьці невялікую колькасьць удзельнічаўшых у конкурсу ячэек з агульнага ліку вясковых ячэек акругі (са 137 удзельнічала—23, альбо 16,8 проц.), прысылка корэспондэнцый аб дрэннай рабоце некаторых ячэек, пад загалоўкам **«першая ад заду», «на конкурс... з самагоннай п'янкай» і «на мёртвай кропцы».** Гэта сьведчыць аб тым, што яшчэ значная частка ячэек практычна не падышла да пытаньняў гаспадарчай работы і ня мае такога вопыту, які мог-бы быць скарыстан організацыяй; што частка (праўда малая) ячэек стаіць на месцы, у сваёй рабоце ня ідзе у ногу з запатрабаваньнем нашага часу і жыцьця.

Як у першым, так і ў другім выпадку патрэбна **практычная дапамога** (а гэта і ёсьць канкрэтнае кіраўніцтва) **ячэйкам знайсьці практычную справу** (напрыклад: **рамонт школы, пажарная дружына)** найбольш важную ў умовах работы ячэйкі, вакол якой яна працавала і ад вырашэньня малых пытаньняў падымалася да вырашэньня больш складаных задач, патрабуючых і больш энэргіі і сіл.

Больш увагі, практычнай дапамогі слабым ячэйкам у іх рабоце, большае іх наведваньне і г. д., дасьць тое, што мы зможам выраўняць слабыя ячэйкі па ячэйкам лепш працуючым, у прыватнасьці на грунце вопыту апошніх, **а высьвятленьню вопыту**—больш увагі больш месца ўва ўсёй нашай рабоце, бо ён дае больш чым нашы абежнікі, дырэктывы у разьвіцьці рашэньняў партыі і саюзу.

А. Красоўскі.

Як губляюцца комсамольцы

Шмат паперы, шмат размоў, шмат камісій

Больш таварыскай чуласьці і ўвагі!

Валакіта і казёншчына.

Комсамольскі білет—рэч невялікая.

Але для комсамольца, у асаблівасьці для таго, што толькі што паступае ў саюз, ён як-бы прадстаўляе сабою адзнаку розьніцы паміж ім і не комсамольцам.

Ёсьць новая прыказка — «валакіта маць усіх парокаў», і вось з-за гэтай самай валакіты адбываюцца ўсякія няшчасьці.

У шмат якіх ячэйках валакіта, у лічбе іншых дзеяньняў займаецца спэцыяльна тым, што пакідае комсамольцаў без сяброўскіх білетаў на доўгія месяцы і гады. Хлапцы спачатку ходзяць у бюро і пытаюць: «А ці хутка»?—І атрымаўшы адмоўны адказ, паварачваюцца і выходзяць. Потым частка гэтых самых «мучанікаў» пакідаюць лічыць сябе комсамольцамі і атрываюцца ад працы...

Тыя-ж самыя вынікі дае валакіта ў правядзеньні маладняка ў сябры ці кандыдаты комсамолу. Бясконцыя пераходы анкет і хлапца ад адной камісіі да другой зацягваюць паступленьне ў саюз на доўгія месяцы.

Гэтыя вандраваньні бываюць такімі доўгімі, што толькі выключна стоічныя натуры здольны выйсьці з іх пераможнікамі, а другія губляюцца па дарозе між гэтымі камісіямі.

Гэта частка нашай працы, такая з віду нязначная, збаўляе нас ад шмат добрых і каштоўных элемэнтаў сярод моладзі.

І ўсяму віною—гэтая самая валакіта.

Растов на Дану--Менск.

Асобныя працаўнікі вучотнага аддзелу Менскага акругкому ЛКСМБ мала зьвяртаюць ўвагі на тых комсамольцаў, якія пераводзяцца з беларускай арганізацыі ў якую-небудзь другую.

Калі комсамольцы прыходзяць да іх, каб зьнялі з вучоту, дык звычайна далікатна і мілагучна ім адказваюць: «Едзьце а мы вам пашлем асабовую справу па запатрабаваньню таго акругкому, у раёне якога вы будзеце». І вось прыехаўшы на месца пасылаюцца патрабаваньні некалькі падрад, але на іх ніхто не зьвяртае ўвагі і ніякіх асобовых спраў, ці справак не высылаюць.

Нарэшце даходзіць да таго, што гэтыя комсамольцы павінны выходзіць з арганізацыі, ня будучы доўгі час ні на якім вучоце.

Паехаўшы ў Растоў на Дану, доўгі час адтуль пасылала комсамолка Рахіль Нібошчык патрабаваньні ў Менскі акругком.

Адказу няма ўжо больш трох месяцаў.

Альфа.

Па два гады праходзіць

(Рудзенская ячэйка, Сьмілаўскага раёну).

У 1925 годзе ў верасьні трох хлопцаў Рудзенскага атраду: Палея, Лосіка і Плашчынскага перавялі ў комсамол. Радасьцю была для іх гэта перадача.

Ня так «прыемна» сустрэла іх ячэйка.

Ячэйка іх прыняла ў кандыдаты, прыстасоўваючы пад іх графу ўстава, што яны—вучні (яны ўчыліся ўзімку ў 7—годцы, летам працавалі на гаспадарцы, сяляне-бедякі). Аднак хлапцы былі зацьверджавы ў кандыдаты.

Хлапцы падалі ў чэрвені 1926 г. заяву аб няправільным прыёме і аб пераводзе іх з кандыдатаў у сябры. Бюро на сваім пасяджэньні разабраўшы гэту заяву ўхваліла перавесьці ў сябры. Сход ячэйкі пастанову зацьвердзіў. Райком таксама зацьвердзіў. Акруговы Камітэт пастанаву яч. і Райкому адмяніў. З таго часу прашло амаль два гады, і так усё хлопцаў перавадзяць з кандыдатаў у сябры.

К-іў

„Памры, а зрабі“, альбо „Кладзі білет“!

У Петрыкаўскай ячэйцы № 2 сакратаром быў тав. Лапета. Калі комсамолец ня зможа выпаўніць свае працы, то замест таго, каб даць параду, сакратар крычаў: «Памры, а зрабі», альбо «кладзі білет», Комсамольцу нехаця прыходзіцца брацца за працу, хоць і не ведае як яе пачаць, бо ўсё роўна ня пасьмеў-бы аб гэтым папытацца сакратара.

Комсамолец Ганчар быў заняты на працы перад яўрэйскім вялікаднем і ня мог наведваць гуртка і агульнага сходу. Ня гледзячы на гэта яму далі выгавар з папярэджаньнем аб выключэньні з КСМ. Калі Ганчар сказаў аб няправільнасьці, сябры бюро сталі сьмяяцца над ім, укідваючы славутую фразу «Кладзі білет». Райком ЛКСМБ адмяніў гэту пастанову, даўшы толькі выгавар і зьвярнуўшы білет, які напужаны Ганчар аддаў сакратару.

Відзеўшы.

Анкеты пакажуць, як правесьці лета

(Полаччына)

Цяпер, калі комсамолам узят курс на ажыўленьне працы, вялізнае значэньне мае мэтад, праз які магчыма было-б дасканальна выявіць запатрабаваньні комсамольцаў.

Ячэйка друкароў рыхтуючыся да летняй працы зразумела гэтае пытаньне. Былі раздадзены кожнаму комсамольцу маленькія анкеты. Пытаньні былі наступныя: 1) якія пытаньні альбо тэмы у цябе засталіся нявырашанымі альбо ня поўнасьцю высьвятленымі ў політшколе; 2) якія пытаньні цябе цікавяць (політэкономія, гісторыя партыі, агульна-адукацыйныя прадметы, матэматыка і інш.); 3) якімі пытаньнямі ты думаеш заняцца ў гуртку самаадукацыі (напішы з кім ты хочаш займацца); 4) якія газэты выпісваеш і рэгулярна чытаеш; 5) якія кнігі ты вызначыў прачытаць за лета. Гэтыя анкеты дапамаглі ў намячэньні пляпаў летняй працы.

З. Прусоўскі.

Хутка--сёмуха

У гэта сьвята водзіцца дрэнны звычай: сякуць маладыя бярозкі і ўбіраюць імі хаты.

— Гэта па дзікарскі.—Ці ня лепш наладзіць экскурсію ў лес і палюбавацца там росквітам прыроды!

„Сакрэт“ сьвята

Гаворачы пра сьвята сёмуху, ніхто звычайна не ўспамінае пра адзінага бога, які складаецца з трох асоб: айца, сына і сьвятога духа.

Хвіліна—і прыгожага дрэўца нястала.

Сьвяшчэньнікі абвяшчаюць «трыадзінасьць» асоб бога недасяжнай таемнасьцю, у якую трэба верыць. Тое самае гаварылі індзейскія, вавілёнскія і эгіпэцкія жрацы пра свае тройцы, якія яны сьвяткавалі.

У праваслаўных падручніках па закону божаму даецца і разгадка пахаджэньня вельмі незразумелага догмату. Там па казваецца ў якасьці прыкладу сонца, у якога ёсьць дыск (кружок)—айцец, сьвет—сын, і цяпло—дух сьвяты.

Вавілёняне былі больш адкрытым. Яны прызнавалі за трыадзінага бога імена сонца, якое мае вялізарную ролю ў гаспадарцы земляроба.

Беларускі народ каля гэтага часу сьвяткаваў пачатак лета і поўны росквіт прыроды.

Для гэтага і цяпер сёмуха –называецца яшчэ «зялёныя сьвяткі». Цэрквы і хаты ўбіраюцца ў зелень, вуліцы ўбіраюцца маладзенькімі бярозкамі, якіх губіцца дарма кожны год нязьлічаная колькасьць.

Першы тыдзень пасьля сёмухі называецца «русальным». На ранейшай думцы народу, у гэты час выходзяць з вады русалкі і гушкаюццца на галінах дрэў. На дзяды перад тройцай памінаюць нябожчыкаў. Усё гэта паказвае на даўнейшы земляробчы характар сьвята, якому дадзена штучна царкоўная назва «тройца».

Ня будзем дзікарамі

Ня лес у хаты, а з хаты—у лес!

12-га чэрвеня—рэлігійнае сьвята, так званая «сёмуха». У гэты дзень сякуць у лесе маладзенькія бярозкі і ўбіраюць імі хаты.

Гэты звычай вядзецца з даўніх часоў. Ён—вялікая згуба для маладняку лесу. На «сёмуху» зьнішчаецца тысячы маладзенькіх, прыгожых, у поўным росквіце, бярозак, каб на другі дзень, калі лісткі павысахнуць, выкінуць іх на сьметнік.

Вясковым комсамольскім ячэйкам і ўсёй перадавой моладзі трэба ўжо зараз разгарнуць працу: растлумачыць сялянам, моладзі, прашкоднасьць гэтага звычаю. Угаварыць сваіх бацькоў ня губіць у гэты дзень маладзенькіх дрэў і інш

Калі ячэйкі своечасова возьмуцца за гэту працу—вынікі будуць значныя.

Трэба на «Сёмуху» ня лес несьці ў хату, а наладжваць экскурсіі ў лес. Гэта будзе куды цікавей і карысьней.

Мікола Глух.

На адзін дзень прыбралі хату...



А потым выкідаюць... на сьметнік.



ПОЛІТЫЧНЫ УЗРОВЕНЬ УЗРОС.

ПЫТАНЬНІ ПОЛІТВУЧОБЫ Ў КОМСАМОЛЕ НА ПЛЕНУМЕ ЦК ЛКСМБ.

„ЗУБРЫСТЫКА“, ПЕРАГРУЗКА І ІНШЫЯ БАЛЯЧКІ.

Навучальны год закончаны. Мы згарнулі працу надзвычайна вырасшай сеткі школ гурткоў. Якія-ж вынікі політвучобы гэтага году? Якія мерапрыемствы да паляпшэньня політвучобы ў Комсамоле? Над вырашэньнем гэтых пытаньняў працаваў майскі пленум ЦК ЛКСМБ.

Перад вырашэньнем двух задач мы сталі ў пачатку 1926-1927 навучальнага году.

Напершае—дасягнуць масавай політвучобы, затым што асноў політпісьменнасьці ня маюць значныя масы саюзу.

Надругое—перад задачай паляпшэньня якасьці забесьпячэньня ідэёвага ленінскага зьместу вучобы.

У якой меры мы вырашылі гэтыя задачы? На пяці акругах (Барысаў, Менск, Гомель, Мазыр і Віцебск) мы маем ахоп гарадзкой організацыі політвучобай на 85 процантаў. Цікава, як гэтыя комсамольцы разьмяркоўваюцца па розных зьвеньнях політадукацыі. На першым месцы стаяць агульна-адукацыйныя школы, якія абслугоўваюць 47,8 процантаў ахопленых вучобай у гэтым годзе. Потым ідуць політшколы, абслугоўваючы 34,8 процантаў і нарэшце сеткай партасьветы ахоплены 17,4 проценты—гэта найбольш разьвітая частка комсамольцаў і саюзны актыў.

Агульна-адукацыйныя школы (у першую чаргу ШРМ) па ахопу якасьці сваёй працы на першым месцы. У Гомелі, ды ў шэрагу іншых месц—нават у сярэдзіне году комсамольцы пераходзілі з політшкол у агульна-адукацыйныя школы, бо цяга да атрыманьня агульна-адукацыйных ведаў узрастае з кожным годам, бо якасьць вучобы ў агульна-адукацыйных школах, зусім зразумела, значна вышэй чым у політшколах. Але ня гледзячы на ўсё гэта наша ўвага да наладжваньня гэтых школ у прыватнасьці грамадазнаўства ў іх, ня досыць добрая.

Політшколы сябе апраўдалі.

Пры ўсіх сваіх недахопах, аб чым будзе ніжэй, — політшколы, бязумоўна, сябе апраўдалі. Лепшы падбор кіраўнікоў —19 процантаў партыйцаў (Віцебск, Менск) лябараторны мэтад, другі дзень вучобы. Лепшыя ў параўнаньні з мінулым падручнікі—такія асобныя дасягненьні гэтага году.

Веды, лічбы гавораць аб тым, што політузровень організацыі ўзрос. Ужо ў гэтым годзе 9,6 процантаў комсамольцаў займалася ў другой ступені. Па гарадзкому раёну Менску скончылі політшколы: добра—64,7 процантаў, здавальняюча—54,3 проценты, не здавальняюча 8 проц. Няма ніякага сумленьня, што ў выніках лепшай пастаноўкі, політасьвета ў гэтым годзе садзейнічала зразуменьню супроць ленінскіх ухілаў партыйнай опозіцыі. Было-б памылкова сказаць, што гэта асноўная задача зразуменьня масай комсамольцаў партыйных пастаноў выканана поўнасьцю.

Гэта задача застаецца найважнейшай і на будучы год.

«Зьмест політвучобы і ў будучым годзе павінен будавацца на пытаньнях політсучаснасьці, на вывучэньні політыкі і задач партыі, на гэтай падставе дабіваючыся ўяўленьня асноўных палажэньняў ленінізму»—такая пастанова пленуму.

Політшколы мелі шэраг сур'ёзных балячак,

ад іх вочоту, ад прадпрыемстваў, да зьнішчэньня гэтых недахопаў залежыць посьпех вучобы ў будучым.

Стараючыся даць больш шырокую суму ведаў комсамольцам—мы пабудавалі надзвычайна шырокую праграму, кожную тэму перагружалі масай матар'ялу. Так, напрыклад, у зьмест гутаркі 11 уваходзіць 1905-1917 г. г., гутарка 12—ад лютага да нэпу. Такіх прыкладаў многа, гэта вяло да павярхоўнага вывучэньня выкладаемага матар'ялу.

Мы не пазбавіліся ў гэтым годзе ад элемэнтаў «зубрыстыкі». Ведае хлапец, што «коопэрацыя шлях да соцыялізму», а задач, ролі ў коопэрацыі часам і ня ведае.

Слаба выкарыстоўваўся мясцовы матар'ял фабрык, прадпрыемстваў у працы політшкол, неяк ня клеілася з практычнымі заданьнямі,--гэта, бязумоўна, мінус.

Шэраг памылак мы дапусьцілі ў камплектаваньні політшкол. Значная частка малапісьменных, якая па дырэктыве ЦК павінна была быць накіравана ў агульна-адукацыйныя школы—застаўлена ў політшколах значная група вучняў сямігодак і іншых школ, дзе выкладаецца грамадазнаўства, займаліся ў сетцы комсамольскага выхаваньня.

І нарэшце, немагчыма лічыць здавальняючым кантроль ячэек над вучобай іх сяброў, кіраўніцтва гэтай вучобай.

Цякучасьць політшкол дасягаўшая месцамі да 30-40 процантаў; дрэннае наведваньне—ад 52 да 76 процантаў (самы высокі) наглядалася ў часе занятках. Усё гэта гаворыць аб тым, што політшкола яшчэ ня поўнасьцю задавальняе запатрабаваньням комсамольцаў, аб аграмадным імкненьні да атрыманьня агульна-адукацыйных ведаў (50 процантаў вышлі з політшкол—у школы агульна-адукацыйныя), аб усё яшчэ ня добрай якасьці вучобы.

Як была справа з політвучобай на вёсцы.

Значна горш чым ў горадзе справа з політвучобай ў вясковых організацыях КСМ.

Праўда, і тут зроблены крок уперад, я гавару аб узрастаючым з году ў год ахопе комсамольцаў партсеткай, перасоўкамі, стацыянаркамі. Пры першым выпуску гэтага году скончыла па сямі акругах: партперасоўкі 1-й ступені—744 комсамольцы, 2-й ступені– 53 комсамольцы, стацыянаркі (па 4-х акругах) комсамольцаў і беспартыйных 514 чалав...

Аб узросьце

політузроўню часткі вясковых комсамольцаў

гаворыць таксама ўзрост гурткоў пав... шанага тыпу, працуючых па праграм... партперасоўкі па трох акругах (Мозы... Барысаў, Калініна) маецца 120 та... гурткоў.

Вынікі-ж працы асноўнай масы вясковых політгурткоў, у якіх займаліся ... падручніку Віргансхага—нязначны. Т... мачыцца гэта перш за ўсе тым, што нас няма падрыхтаванага кадру кіраў коў вясковых політгуркоў, няма дос... добрай наладжанасьці вучобы ў вёс... У адным і тым жа раёне адна ячэй... пачала занятки ў сьнежані, другая ў ... тым, трэцяя ў сакавіку. Адна скончы... праграму, другая распрацавала 2-3 ... таркі. Трэба яшчэ дадаць, што і мэ... дычнае кіраўніцтва ў працы было ня ... сыць добрае.

У горадзе і ў вёсцы саюз у гэтым го... пашоў значна ўперад у справе пры... саваньня політвучобы да нацасаблівась... нашай краіны, да абслугоўваньня мол... на яе роднай мове. Быў перакладзен па... ручнік для вёскі на беларускую мову.

Беларуская мова выкладалася ў ... радзкіх політшколах (акрамя Менск... Мозыру). Гэтыя дасягненьні трэба зь... цаваць і павялічыць у будучым годзе.

На аснове пастаноў 5-й усесаюз... конфэрэнцыі ЛКСМ і ЦК УсеКП(б) пле... вызначыў асноўныя мерапрыемствы паляпшэньня політвучобы і сыстэмы ... літвыхаваньня будучага году.

І. Ліўшыц

Літаратурная старонка

Ал. Жараў

Сьмейся, вецер!..

Сьмейся, вецер! Расхістаны-сьмейся!
Агітуй па лугох, хвастун!
А паспрабуй чырвонаармейцам
Гадамі стаяць на пасту...

...Ты грымеў па лясох: рэвалюцыя!
Уздымаючы ў неба сьцягі...
Ну, а я—у падраных бутцах
Крочыў з лягера ў лягер.

Памятаю-на нашых рунях
Атрутна гнязьдзілась зараза...
Ну, а ты абнімаў красуню
Ля старога, кудлатага вязу.

Ты ўмеў, падгуляўшы ліха
Гнаць у шкло ўдар за ўдарам...
А я, згрызены тыфусам,
Валяўся на брудных нарах...

Ты хваробу нікуды ня дзенеш,
Калі ўвесь задрыжу ў ліхаманцы...

І не знаеш:
У мяне Юдзеніч
Куляй засеў у лапатцы!..

Добра, вецер...
Гуляй і сьмейся!
Ля млыноў-песьні пей, хвастун,..
Бо ня спробываў чырвонаармейцам
З вінтоўкай стаяць
На пасту!..

Пераклаў з расейскае мовы

Ю. Л.

М. Хведаровіч.

Досьвітак.

Бачу родныя узвышшы,
Стройных волатаў лясоў.
Як-бы нехта ўзоры вышыў,
Беларускіх паясоў.

А ў нізу пасланы долы,
Расьцьвіла чаромхі вецьць.
Ходзіць, ходзіць вецер голы,
Забіяка па траве.

Нагінаюць ніц галовы,
У росах чыстых васількі.
І здаецца шэпчуць словы,
Лозы ціха ля ракі.

Хто я тут? і кім пасланы
Рваць галовы васількоў?
Разьлівае сьвежы ранак,
Па даліне малако.

Не парушу, ні ўстрывожу
Дзіўных мараў хараства.
І чаруе і варожыць
Шаўкавістая трава.

Згінуў холад ночы мглістай,
Песьні працы ў сяле.
На траве крыштальна-чыстай,
Мой застаўся чорны сьлед.

Бр. Люгоўскі.

За трактарам.

Гэй, нясіся, конь сталёвы
Ды гудзі, гудзі, мацней;
Дзень вясёлы і ліловы,
Шэпча ўзьмежкам аб вясьне.

Я хачу каб песьню нашу
Ліць у даль з грудзей гулчэй;
Каб ў рытмах вольнай працы
Сэрца білася мацней!

Дык гудзі-ж ты, конь сталёвы
Патрывож журбу балот,
Завіхры там песьню працы.
Дзе шуміць вяком чарот!

Юрка Лявонны

* * *

Быццам стала варта на шырокім полі—
пры дарозе ў пылу стромкія таполі.
Елі тых таполяў ветры з-за курганаў,
напаўзалі з поўначы мокрыя туманы.
Лапамі даўгімі пагражалі раньню,
але тыя дрэвы верылі ў сьвітаньне.
Абнялась бярозка з малайцом-таполем,
уздыхнулі разам аб чаканай волі.
Разьняслі па сьвету звонкія лісты:
«уставай, галодны, хто шчэ' неастыў!»
У бурлівы гоман, у жыцьцёвы лёскат
барацьба ўлілася агнявым усплёскам.
Скінулі прыгнёты, скінулі прымусы,—
заквітнела радасьць мілай Беларусі.
І таполі стромкія ў шаўкавістым сьне
шапацяць айчыве аб яе вясьне.

Алё... Алё...

К. Губарэвіч.

(Апавяданьне).

— Што?...

— Шэфы прыехалі, хадзем хутчэй!...

— Чаго, бразгатню іх слухаць, ідзі калі ахвота...

— Дурань, сёньня, казалі радыё будзе...

— Якое?...

— Ну ведаеш... казаць нам будуць... толькі ня шэфы, а чорт ведама адкуль і хто...

— Ну?!

— Папраўдзе...

— Сходзім...

Куча сялян так зьбіраючы адзін другога, пашлі да хаты-чытальні... Там ужо бабы, дзяўчаты, хлапцы, дзеці—ходарам хадзілі. Ці скора радыё загавора...

— Таварышы!...—крыкнуў адзін шэф, ўзабраўшыся на калоду.

— Праз паўгадзіны будзеце чуць па радыё лекцыю па сельскай гаспадарцы з Масквы...

— Ого!...

— Прашу, таварышы, слухаць уважліва, каб маглі зразумець; разьмяшчайцеся як найлепей і слухайце...

— Ды ўжо-ж, дзень гатовы чакаць, калі гэта праўда толькі была.

— Дык ці маніць жа вас будзем, што вы!...

— А хто вас ведае!

— Ну, добра, пагаворым пасьля, а цяпер ціха...

— Ат, чмуту наводзяць... Якому гэта дурню глоткі ня шкода крычаць з Масквы... Уздумаюць нейкага віхранца, каб галовы чмуціць, усумніўся дзед Апанас, выбіваючы аб ногаць люльку.

— Вядома, што чмуцюць—падтрымаў яго Андрос.

— Я колечы быў на японскай вайне, дык то-ж прышлося бачыць чмуту такую... Кітаец адзін у будцы, як вар'ят: бегае, бегае, а тады выхапе нож з паўаршына ды ў глотку сабе, шчэ і ў канец пастукае каб далей лез... А не стужкі чырвоныя з вуха пачне цягаць... Дык што-ж гэта праўда?!

— Яно то хвароба яго ведае, як думаць тут—разважаў Агей каля прасла.

А то-ж во, трубку тут паставілі, а з Масквы нехта ў яе крычаць будзе... Гэта-ж дурню і то зразумела, што гэта чмута!...

— А што яны ня змогуць залезьці сюды куды ў ліпнік, у гальлё, дык казаць схаваўшыся, а ты слухай як з Масквы—зноў усумніўся Андрос...

— А праўды!... аднагалосна згадзіліся некаторыя скоса глянуўшы на густы ліпнік каля чытальні...

— Таварышы, ціха!... слухайце, зараз пачне, вось праз паўхвілінку...

Радыё-прыёмнік кашлянуў, зашчабятаў... і пашло...

... Алё, Алё!... слухайце, станцыя Камінтэрн... Алё, Алё...

Во чуеш, у галоп!...

Які галоп, гальлё, слухай-ка добра...

... Алё, слухайце, Алё...

— Ды добра, пачынай ужо, і так ведаем, што з гальля трэба слухаць... Алё, пачынаю... пайшоў, і пайшоў...

Грамада стаяла наўтоўп і скоса толькі паглядвала...

Казаў, казаў, доўга, пакуль ня ахрып і ўрэшце сказаў т'кі: канчаю...

— Як хочаш—параілі некаторыя... Іншыя сядзелі і толькі люлькі смакталі, нібы хацелі высмактаць самы сэнс толькі што чутага.

— Ну, што, таварышы, паверылі?!...—запытаўся шэф.

— Ат, маленькіх папалі, ці што?... з гольля кожны можа крычаць...—не паддаецца дзед Андрос...

— Дык вы-ж паглядзеце, пашукайце, калі ня верыце...

Ідзеце хто-небудзь пашукайце... хутчэй...

Андрос, што больш усіх сумляваўся, падцягнуў пояс і пачоўпся ўпеўнена...

Некаторыя падпялі рогат, а іншыя напруджана сачылі за вынікамі. Хвілін праз дваццаць Андрос выдраўся з гольля...Толькі лоб мокры быў...

— Зьвільнуў?!.—сьмяяліся хлапцы...

Андрос вылаяўся толькі.

— Ну, во, бачыце таварышы, нікога няма... А цяпер будзе пець хор, гэты ўжо ў ліпнік не схаваецца, а калі і цяпер шчэ' ня верыце, дык ідзеце чалавек колькі ды прысядзьце ў ліпніку, а мо' на ваша шчасьце і прысочыце...

— Ах, каб мая галава ні даждала!— крыкнуў адважліва Андрос,—пайду і зноў, брэша ня выкруціцца!..

Адважліва запатаў у ліпнік.

— Во як... А ніколі ж ня чувалі шчэ такія сьпевы!..

У заміраючых зыках скончылася апошняя песьня. Усе як хто стаяў так і засталася, рашчыніўшы рот...

Зліпніку... вылазіў Андрос—браўся праз гальлё, толькі шапка ледзь трымалася на макушцы... Вылез... Абцёр рукавам рашчырванеўшы твар і... ня ведаў што сказаць.

Вось за тым...

Я ў цьвеце жыцьця цяпер
Акунуўся ў вясновую песьню
Вось затым так хочацца мне
У душы сваёй радасьць несьці...

* * *

Вось затым мне хочацца так
Падзяліцца з вясновым раньнем
Свае думкі вясьне расказаць
І абняць залатое сьвітаньне.

* * *

І цяпер так хочацца мне
Праімчацца над возерам сінім
Сваёй радасьцю доўга зьвінець
Над зялёна-застыўшай далінай.

І цяпер зажадалася мне
Гамовіць ды з зялёным борам
Эх, вы сосны, сосны мае...
Абніму вашых ветак узоры...

* * *

Вось затым я цяпер хачу
Сваю радасьць далёка несьці,
І ў сінюю даль маю
Рассыпаць залатыя песьні...

Ал. Розна.

НОВЫЯ КНІГІ.

Атрыманы ў рэдакцыю на рэцэнзыю новыя кнігі выдавецтва ЦК УсеЛКСМ «Молодая Гвардия».

Кнігі маюцца ў продажы ў Беларускім Аддзяленьні «ГИЗ'а» Р.С.Ф.С.Р і ва ўсіх расійскіх аддзелах кніжных магазынаў Белдзяржвыдавецтва.

Н. ЧАПЛИН. Год работы в новой полосе (Доклад ЦК ВЛКСМ)—стр. 64, ц. 25 к.
М. ЕРОГОВ. Об участии КСМ в под'еме сельского хозяйстве и кооперировании деревни—стр. 48, ц. 25 к.
НИКИТИН А. Военно шефская і спортработа (Работа городской ячейки ВЛКСМ)—стр. 29, ц. 15 к.
ГРИШИН Зим. О работе среди сезонной молодежи—113 стр., ц. 55 к.
ЭМИЛЬ ЗОЛЯ Карьера Ругонов (Роман)—стр. 302, цена 1 р. 50 к.
СБОРНИК Деревенским пионерам о работе летом—стр. 36, цена 25 к.
ФАЛЬК М. и ИВАНОВ. Пионер-площадка массовая и оздоровит. стр. 30, ц. 15 к.
КАРИНСКИЙ В. Необычайные приключения Джимса—стр., 11 цена 25 к., Звездная книжка—стр. 10, цена 35 к.
ВИРКИНС Б. Пионеры за рубежом—стр. 108, цена 45 к.
ЮРЦЕВ Б. Пионэрская живая газета (материал для постановок) стр. 150, ц. 80 к.
ФАБРИЧНЫЙ Андрей Как боролись английские рабочие—стр. 48, ц. 30 к.

Мы гатовы!

Ліст з падшэфнага лінкора імя «Парыскай Комуны».

Раніўняе радыё прынесла весткі аб разрыве з Англіяй. Паведамленьне ТАСС—на старонках «Ільлічоўкі» карабля.

У 11 гадзін—вялікі збор. Каманда на верхняй палубе. На лінкоры «Парыская Комуна»—Камандуючы Балтфлёту і РВС. Агляд—і кароткі мітынг. Тлумачаць значэньне моманту. 20 хвілін і сыгнал дае знаць, што РВС з карабля адбыў.

У 14 гадзін зноў вялікі збор. Неба зацягваецца хмарамі. Парывісты вецер. Але на верхняй палубе да 800 чалавек. Коратка тлумачыць камісар сутнасьць падзей. Заклікае да гатоўнасьці і цьвёрдасьці. Вытрымка, вучоба—заклад перамогі. Тое-ж гаворыць і камандзір. На зло пашоў дождж—але каманда ловіць кожнае слова камандзіра. Заключныя словы прамоў сустракаюцца громам воплескаў і «ура».

Заключэньне — у рэзолюцыі. Вось яна:

«Заслухаўшы даклад камісара карабля тав. Настусевіча аб разрыве гандлёвых зносін з Англіяй—агульна-карабельны сход асабовага складу лінкора «Парыская Комуна» адказвае на вызаў ангельскіх імпэрыялістых сваёй поўнай баявой гатоўнасьцю.

Падтрымоўваючы і адабраючы мірную палітыку Савецкага ўраду, мы ні на адну хвіліну ня спускаем зоркага вока з кругавіду. Урасплох нас не застануць,—замяшацельства ў нашых шэрагах ня знойдуць. Савецкі Саюз—гэта 10 год бурнага росту социялістычнай будоўлі, сусьветнай пролетарскай рэволюцыі. І аднавіць 1918 год—з усімі яго блёкадамі, інтэрвэнцыямі і крыжовым паходам — ангельскім цьвёрдалобым ня ўдасца.

Упэўненыя ў праваце сваёй рэволюцыйнай справы, упэўненыя ў вялікую творчасьць і сілу працоўных усяго Савецкага Саюзу, упэўненыя ў сваю баявую цьвёрдасьць і здольнасьць мы ня сумліваемся і ў такім жа цьвёрдым падтрыманьні Савецкай краіны, з боку сусьветнага пролетарыяту і ў асаблівасьці ангельскага.

Прэч вайну—наш лёзунг, але калі нам яе навяжуць—мы гатовы!

«Парыская Комуна»—памятае гэроя̆ў комунараў. Чырвоны вымпел будзе разьвівацца на мачце—паказваючы нашу баяздольнасьць і гатоўнасьць, працоўным усяго Савецкага Саюзу і нашаму рабоча-сялянскаму ўраду».

«Падвяло нас надвор'е—але ангельцы нас не абшукаюць—выкрыем яе махінацыі»—сьмяюцца чырвонафлётцы расходзячыся з мітынгу пад гукі духавога оркестру.

Лінкор «Парыская Комуна» зорка сочыць за кругавідам!

Мы цьвёрда стаім на варце!

Я. М.

Цытадэль Кранштат.

Васіль Каваль

ПАД РЫТМЫ ДЫ ГРОХАТ...

(На экскурсыі газэты „Чырвоная Зьмена")

Далі шырокія

Рытмічна ды шпарка бяжыць паравоз, грамыхае ды стукае...

— Тррах-тах-тах!

Мінулі ўжо беларускія саломенныя, бура-зялёныя вёскі, хутары, палі зарунелыя схаваліся па задзе, нізіны ды ўзгоркі жоўтыя, балоты, рэчкі пазавіваліся і перарэзалі палі. Гаі ды хвоі шумліва сьпяваюць. Мы даўно пераехалі мяжу, пачалася Расея - шырокая, як далі...

А паравоз гудзіць, правады музыку вясёлую заводзяць аб тым, што вось хутка наша імкненьне прывядзе ў вялікі горад, дзе многа было вялікіх падзей рэволюцыі ..

У вагоне вясёласьць, гармідар..

Гаворкі ды сьмех.

«А, Лявоніха, Лявоніха мая!» — цягнуць галасы хлапцоў, а дзяўчыя, тонкія падхапілі:

«Гляну, гляну я ў ваконца...
Э-э-эй, працію ясная-а со-онца.
— А-э-эй!..

А ў туманнай далі ўжо чутно, як равуць гудкі з чорных труб; што сотнямі абапал відны; потым кідаюцца у вочы будынкі фабрык, заводаў. Тут няма зеле ні-жалеза, стукат, дым і туман.

У расчыненае вакно вагона высунуліся галовы экскурсантаў, дружна падхапілі беларускую:

«Ад веку мы спалі...»

Ленінград, станцыя...

З вышкі Ісакіеўскага сабору

* * *

14-га мая.

Вось аграмадны Ісакіеўскі сабор, з таўшчэзнымі марморовымі калёнамі-слупамі.

Падымаемся з праважатым па зьвілістых лесьвіцах, праз цёмныя капуркі на самы верх. Ногі патрэбна падымаць высока і моцна трымацца рукамі за жалезныя абапал пруты. Пачынае з няпрывычкі кружыцца галава. Хады на самы верх 25--30 хвілін, вельмі душна, а ўжо на самай вышцы раптам у твар кідаецца парывамі вільготны вецер, дуе холад...

Як паглядзіш уніз, адчыняецца перад вачыма шырокі кругагляд на ўвесь горад, які ляжыць у катлавіне, паабапал, на кружглядзе--сіняя паласа ўзгоркаў... Горад распляніраваны--проста, ва ўсіх напрамках, бо цары, пачынаючы з Пятра І стараліся падаць яму прыгожасьць--і шмат палягло людзей тут, пакуль на балоцістым месцы ўзьнік вялікі горад.

Унізе--горад гудзіць, стукае...

Парывісты вецер жорстка акутвае твар. Людзі, аўтобусы, здаюцца зусім маленькімі; будынкі квадратовыя. І першае кідаецца ў вочы зялёнамутная Нява ў гранітных берагох, потым яна цягнецца да Фінскага заліву, а там--чорная палоска--Кранштат.

Абшар гораду бяз прыгарадаў 97 кілёметраў (91 вярста); насельніцтва ў 23 годзе налічвалася 722 тысячы...

Асьцярожна, зморацыя, спускаемся па тых-жа вілаватых лесьвіцах уніз.

Такі грукат, што няпрывычнаму вясковаму чалавеку рэжа вушы, пачынае балець галава...

Петрапаўлаўская крэпасьць

На Васілеўскім востраве, на беразе Нявы--крэпасьць-вал.

Яшчэ ў 1742 годзе была пабудавана перш земляная крэпасьць--так-жа рукамі прыгонцых, потым пабудавалі каменныя сьцены. Чужаземны архітэктар будаваў крэпасьць 34 гады. «Калі паглядзець на яе зьверху,--кажа наш праважаты,--будзе няправільны шасьцікутнік». Зараз-жа ў глыб вядуць пятроўскія вароты. Паабапал казэматы...

—«У Петрапаўлаўскай крэпасьці--гаворыць праважаты,--як у люстры адбіваецца рэволюцыйная барацьба. Тут сядзелі: Радзішчаў, петрашэўцы, першамартаўцы...»

Вароты, праз якія вялі праступнікаў!

Направа Петрапаўлаўскі сабор, дзе знаходзяцца грабніцы ўсіх цароў, уся гэта раскоша абаграна кроўю, забойствамі...

Некалькі басьціёнаў; галоўны з іх--Трубецкой, дзе сядзелі ўсе галоўныя палітычныя «праступнікі».

Цэлыя жахі апавядае нам праважатый...

Вось у адным з пакояў курсістка Ветрава кончыла жыцьцё самагубствам (абліла сябе газай і падпаліла), ня могшы перанесьці жорсткага рэжыму.

Ні ў адну з камэр не праходзіла сонца і сьвету, нават неба кавалка ня ўбачыш...

Ні адзін з крэпасьці ня бачыў ніколі сьвету, ня выходзіў жывым; калі прыводзілі туды «праступніка», які ішоў супроць самаўладзтва, значыць яму была пэўная сьмерць у гэтых сьценах ці на віселіцы. Толькі у пэрыод рэволюцыі вышлі адтуль усе. Такія, як вядомы рэволюцыянэр і вучоны Марозаў, прасядзеўшы там 30 год, і зараз жыве.

Так на працягу некалькіх стагодзьдзяў гэтыя сьцены захоўвалі ўсіх тых, хто меў вольную думку.

Так было...

А зараз няма...

Гэта праўдзівае люстра барацьбы лепшых людзей-сыноў сваёй эпохі—за прыгожую будучыню...

На якіх дражджах растуць цэны?

На дражджах бесгаспадарнасьці, расьцяпства і бюрократызму.

Абсьледваньне Наркамгандлю выявіла, што нізавая вясковая коопэрацыя вельмі слаба выконвае дырэктывы аб зьніжэньні цэн.—Прычыны гэтаму: неразуменьне рацыяналізацыі, бясплянавасьць і бесгаспадарнасьць, бюрократычныя адносіны да працы—

Цяжка было спаткаць...

Кампанія масавага абсьледваньня нізавой коопэрацыйнай сеткі закончылася. Зьвярнуліся выехаўшыя на месцы дзеля рэвізыі гандлёвых організацый прадстаўнікі Наркамгандлю і Белкоопсаюзу.

Канчатковыя вынікі гэтай масавай праверкі Наркамгандлем яшчэ не падведзены, яны будуць апублікаваны не раней 10 чэрвеня. Але ўжо зараз поўнасьцю высьветлен той факт, што **выпадкі самавольнага павышэньня цэн, невыкананьня дырэктыў Наркамгандлю аб рацыяналізацыі апарату і гранічных накідках** зусім не зьяўляюцца рэдкасьцю. Наадварот! **Цяжка было спаткаць такую коопэрацыю на вёсцы, якая бы цалкам праводзіла ў жыцьцё дырэктывы Наркамгандлю.**

Аб гэтым яскрава кажуць матар'ялы абсьледваньня некаторых сельскіх спажывецкіх таварыстваў, якія мы ніжэй зьмяшчаем.

Як прагарэлі негарэльцы

Негарэльскае спажывецкае таварыства ўяўляе сабой яскравы прыклад „рацыяналізатарскай“ пастаноўкі гандлёвай справы. Дзякуючы бясплянавасьці, бесгаспадарнасьці і нядбайнасьці праўленьня, яно мае вялізны **дэфіцыт**.

Асноўнай прычынай, якая прывяла спажывецкае таварыства да такога становішча, зьяўляецца не рэалізацыя цэлага шэрагу тавараў, якія **ляжаць на складзе бяз усякага руху**. Справа ў тым, што пры закупцы тавараў праўленьне зусім **ня ўлічвала запросы сваіх пайшчыкаў**. У выніку,—вялізныя запасы солі па дарагой цане, іржавых кос, цукерак (19 пудоў) і г. д.

Адначасова мелі месца ненармальнасьці з дастаўкай прадуктаў патрэбных усяму насельніцтву. Напрыклад, перад сьвятамі праўленьне **перапрадала ўвесь свой запас пшанічнай мукі прыватным гандлярам, якія ўзьвінчвалі цэны на яе да 34 кап. за кілё, замест 28 устаноўленых Наркамгандлем.**

Калі гаспадарнічаць, дык ужо да канца: „ведай нашых!“ Разьмясьціўшы ўсе свае сродкі на пакупку вышэйназначаных малаходкіх тавараў, якіх ніхто [illegible] купляў, праўленьне знашло магчымым [illegible] ўсякіх гарантый вытварыць шырокае крэдытаваньне пайшчыкаў таварамі на суму 1600 руб. Адным словам: „любі бліжняга, як самаго сябе“. Але ня думайце, што негарэльскія праўленцы заставаліся такімі „бескарыснымі“ і толькі дбалі аб дабрабыту сваіх пайшчыкаў, прыватных гандляроў і каго ўгодна. Трэба-ж і самым пажывіцца чым небудзь!

І вось **члены праўленьня негарэльскага спажывецкага таварыства растрачваюць 548 руб.**

У сучасны момант член праўленьня негарэльскага таварыства Чэлышаў-галоўны растрачык арыштаваны, а старшыня праўленьня Чурылаў-выняты з працы.

„Ад сядзеньня нічога не баліць“.

Менскае аддзяленьне Белкоопсаюзу правяло рэвізыю **Пухавіцкага спажывецкага таварыства.**

Кампанія па збору паяў выканана **толькі на 22 проценты**. Сярод членаў праўленьня адсутнічаюць дысцыплінаванасьць, разьмеркаваньне функцый, **кожны з іх дзейнічае па свойму і ня слухае другога**. Існуюць ненармальныя ўзаемаадносіны паміж членамі праўленьня і рэвізыйнай камісіі: апошняя бярэ на сябе функцыі праўленьня і наадварот.

Характэрны факт: пасяджэньні праўленьня сумесна з рэвізыйнай камісіяй наладжваліся ледзь ня кожны дзень. Дзеля чаго?—пытаецеся вы.—Ці-ж гэта магчыма, каб кожны дзень! Не, члены праўленьня і рэўкамісіі пухавіцкага спажывецкага таварыства ня здурнелі. **Пасяджэньні гэтак часта наладжваліся з тае прычыны, што паважаным коопэратарам аплачваліся гадзіны патрачаныя на ўдзел у пасяджэньнях:—„чаму-ж не засядаць, калі за гэта грошы плоцяць, а ад сядзеньня нічога не баліць“.**

Фінансавае становішча таварыства вельмі дрэннае. Дзякуючы „гаспадарнай дзейнасьці“ праўленьня, **закуплена шмат няходкіх тавараў на 8.500 руб, выдаткі на ўтрыманьне штату складаюць 12 з палов. процантаў усяго звароту.**

— А як-жа цэны зьніжаліся?—лепш ня пытайцеся. Кожнаму зразумела, якое можа быць зьніжэньне пры такіх абставінах!

„Ррацыяналізацыя“.

А вось **Славянскае спажывецкае таварыства**, моцна „упяміўшае“ сабе сутнасьць рацыяналізацыі і праводзячае апошнюю ў жыцьцё.

Яно ямае 12 крам, кожная з якіх мае па 5 аддзяленьняў (бакалейнае, мэталёвае, скуранае і г. д.). **Усе гэтыя аддзяленьні адгароджаны адно ад другога сьценамі і маюць доступ толькі з вуліцы, кожкае праз асобныя дзьверы.**

Цяпер увявеце сабе такі малюнак: спажывец у адным аддзяленьні купіў махорку і солі і яму патрэбна яшчэ пара ботаў. Прыкашчык (адзіны на ўсю краму) выганяе ўсіх пакупцоў, замыкае дзьверы бакалейнага аддзяленьня і адмыкае скуранае... Калі-ж гэтаму спажыўцу патрэбна яшчэ і сякера і цьвікі, дык скуранае аддзяленьне замыкаецца, прыкашчык з пакупцамі выходзіць на вуліцу, адчыняе дзьверы ў мэталёвае аддзяленьне—і так бясконца...

Такім чынам няшчасныя пакупцы бегаюць з аднаго аддзяленьня ў другое, лаючы на чым сьвет стаіць „рацыяналізацыю“. А бядак прыкашчык да вечару так намучаецца, што ледзь цягае ногі... за тое „ррацыяналізацыя“

А Гогаль маладзец усё-ж ткі!..

„—Я, таварышы, павінен паведаміць вас аб няпрыемнай навіне—да нас едзе рэвізор“,—так інформаваў старшыня **Талочынскага спажывецкага таварыства** членаў праўленьня. Інформаваў у чыста гогалеўскім стылю.

— Які рэвізор?

— А той самы.. Зьніжэньне цэн праверыць... З Акргандлю.. А пагэтаму прапаную вам безадкладна зьмяніць прэйс-курантныя цэны шляхам закрасьленьня старых цэн і надпісваньня новых.. Ну! што-ж вы стаіце як аслупянелыя? Хутчэй пачынайцеся, ды глядзеце каб рэвізор не праведаў пра нашы 8 пудоў шакаладу!

І вось закіпела работа. Адны з анучамі ў руках сьціраюць лічбы, якія абазначаюць цану тавару, другія надпісваюць новыя. У захапленьні „зьнізілі“ цэны ў двайным і трайным разьмеры. Скончыўшы працу, радасна ўздыхнулі і здаволена сталі чакаць „рэвізора“.

Але „рэвізор“ інструктар Аркгандлю не паверыў ніводнаму слову талочынскіх праўленцаў. Аб махінацыях з выпраўленьнем прэйскурантных цэн красамоўна сьведчылі кавалачкі крэйды, якія яны забыліся вынесьці пры ўсім сваім „усердии“. Калі хапіліся за дзяркач, стала позна—інструктар заўважыў.

Ня гледзячы на гэта, коопэратары пачалі скардзіцца інструктару на дрэнную якасьць тавараў, на дрэнны асортымэнт, што „сяляне ўпарта не жадаюць купляць у іх патрэбных сабе рэчаў і ідуць да прыватнікаў“. Але змаўчалі пра тое, што нядаўна завезьлі ў Талочын 8 пудоў такога „патрэбнага“ сялянам тавару, як шакалад!

Яшчэ за колькі дзясяткаў год Гогаль дагадаўся напісаць аб талочынскіх коопэратарах!.. Маладзец, дальбог!

Я. Зельцар.

Сёньня ўзьвіваецца флаг над лягерамі беларускай дывізыі

Уся комсамольская організацыя выходзіць у лягеры на ўрачыстае адчыненьне.—Масавыя спортвыступленьні.—

Пад знакам ваенізацыі

Сёньня, 5-га чэрвеня, урачыста адчыняюцца лягеры N-скай беларускай дывізыі ім. Фрунзэ і Аб'яднанай Беларускай Ваеннай Школы. На адчыненьне з гораду прыбываюць рабочыя дэлегацыі, **уся комсамольская організацыя**, фізкультурнікі і гурткі ТСАавіяхіму.

Роўна ў 10 гадзін раніцы на плошчы Волі адбудзецца **кароценькі мітынг і салют**, а затым усе ўдзельнікі організаваным парадкам накіроўваюцца ў лягеры.

Сьвята пачнецца а 13 гадзіне дню **аглядам часьцей лягернага збору**. Затым—**урачысты ход** прысьвечаны адчыненьню лягераў.

А 16-й гадзіне пачынаюцца **спортгульні**: бег на розныя дыстанцыі, эстафэта, пераскакваньні, сьляпая шарэнга, біцьцё гаршкоў, бег з яйцом, масавыя спортвыступленьні. Акрамя таго, адбудзецца **конкур-іппік** конных часьцей лягернага збору і футбольны матч паміж камандамі дывізыі і АБВШ.

На спортгульнях будуць выступаць **спортгрупы і плястычна-рытмічны гурток клюбу імя КІМ.**

Адчыненьне лягераў будзе скарыстана для **шырокай ваенізацыі насельніцтва, асабліва комсамолу**: група комсамольцаў у 300-400 чал. пойдуць у лягеры баявым парадкам, выконваючы задачу баявога ахраненьня на паходзе. У лягерах з 15 гадз. будзе працаваць хім-камэра з паказным акурваньнем. Праз камэру будзе прапушчана 150-200 жадаючых т. т. з грамадзянскіх організацый; будуць працаваць 3 стралковых ціры, праведзены паказныя, фугасныя ўзрывы, паказана работа вайсковых сабак.

Організаваным парадкам асобныя групы будуць наведваць чырвонаармейскія палаткі і знаёміцца са зброяй часьцей.

Будзе адчынена выстаўка вайсковых кніг, іСЬці продажа і лётарэйны розыгрыш іх.

Прыняты меры, каб забясьпечыць лягеры ў патрэбнай колькасьці вадою і мэд. дапамогаю.

Цэрабкоп організуе спэцыяльныя харчлаўкі.

Сьвяткаваньне закончыцца вечарам чырвонаармейскай самадзейнасьці.

Новыя музыкі

Да паказальных концэртаў Белмузтэхнікуму.

У сучасны момант Беларускі Дзяржаўны Музычны Тэхнікум дае пролетарыяту Менску справаздачу аб сваёй працы на працягу трох год. Наладжваюцца чатыры вялікія концэрты, білеты на якія будуць разьмеркаваны па прафэсыянальных і грамадзкіх організацыях і вайсковых часьцях.

Усе галіны сваёй працы пакажа на гэтых концэртах Музтэхнікум. І сапраўды, ёсьць у яго, што паказаць.

Тэхнікум мае ўжо клясы ўсіх інструмантаў сімфонічнае аркестры (апрача гарфы), ён мае цэлы шэраг добрых солістых-сьпевакоў, піяністых, скрыпачоў і інш., ён мае ўжо сваіх компазытараў (Кавалёў), ён мае сваю сімфонічную аркестру, ён падрыхтаваў ужо цэлы шэраг сьпевакоў для опэры. Заміл аваньне да ўлюбёнага мастацтва, пачуцьцё абавязку перад працоўнымі гушчамі і напружаная праца далі свае добрыя вынікі.

Ёсьць у тэхнікуме і хібы.

Да апошніх трэба аднесьці перш за ўсё малую працу ў галіне популярызацыі музыкі сярод працоўных гушчаў, адсутнасьць сталага хору і іншыя. Гэтыя хібы, бязумоўна, павінны быць зьнішчаны.

Белмузтэхнікум ёсьць сапраўдная пролетарская ўстанова і, як гэткая, сапраўдная **кузьня пролетарскага мастацтва**.

Аграмадная большасьць яго слухачоў альбо самі сябры профсаюзаў, альбо дзеці сяброў. Комсамольская ячэйка ў ім досыць моцная. Прадстаўнікі слухачоў уваходзяць ува ўсе установы, якія кіруюць жыцьцём і дзейнасьцю тэхнікуму. Побач з музычнай вучобай пролетарская грамадзкасьць. Так рыхтуюцца новыя музыкі новага нябывалага раней тыпу!

Орфэй.

С у д.

Не спадабалася...

Доўгі час наведвала 16-гадовая Гіта Гольдзінер Біржу Працы. Хацела яна здабыць сабе якую-небудзь работу, каб палепшыць сваё матар'яльнае становішча. Вельмі дрэнна жылося ёй.

Аднойчы мары Гіты збыліся. Паступіла яна працаваць у пякарню да саматужніка Хаіма Хаета. Быў зроблен колдагавор, у якім указвалася колькі гаспадар павінен ёй выплачваць за работу ў месяц, аб выдачы належнай спэцадзежы і інш.

Прашло некалькі месяцаў. Гіта працавала на новым месцы бронь-вучаніцай, старалася ўгадзіць гаспадару, акуратна спраўляла сваю работу і з нецярпеньнем чакала канца месяцу, каб атрымаць сваю зарплату і аднесьці грошы сваёй старой маці.

Раз, калі Гіта прышла на працу, як заўсёды, гаспадар сустрэў яе вельмі няпрыветліва. Накрычаў на яе і сказаў;

-- Можа-ж ісьці да хаты. Мне такіх гультаёў ня трэба!

Няведаючы ў чым справа і не зразумеўшы-за што яе гаспадар выгнаў, Гіта пашла ў саюз. Калі гаспадара выклікалі ў саюз, дык ён, размахваючы рукамі, абурана заявіў:

— На якога чорта мне патрэбна такая працаўніца, якая не спраўляецца са сваёй работаю, а яшчэ атрымоўвае грошы па 3-му разраду!

Аднак экспэртыза выявіла, што **Гольдзінер ўпаўне падыходзіць да сваёй працы і можа атрымоўваць па 3-му разраду.**

Справу перадалі ў суд. Трудсэсыя г. Менску, разабраўшы гэту гісторыю, знайшла, што Гіта, згодна колдагавору, павінна была працаваць да 1-га студзеня 1928 году, і што звальненьне яе ёсьць парушэньне 47 ст. КЗОТ. Прымаючы гэта пад увагу трудсэсыя пастанавіла **вастанавіць Гіту Гольдзінер на тую самую працу з выплатай ёй за прагулы 83 руб. 76 к.** Супроць гаспадара Хаіма Хаета ўзбуджана крымінальнае прасьледваньне па 133 ст. УК.

Рыгор.

Газэта—у абедзены перапынак.

Скарыстайце вопыт.

(Менск, шапавальная фабрыка).

Бывае ў абедзены перапынак чутны сваркі, няпрыстойныя жарты, хуліганства. Па ініцыятыве комсамольцаў ухвалілі чытаць у часе абеду газэту.

Цяпер, калі хто з комсамольцаў чытае, усе ўважліва слухаюць і няма часу хуліганіць. Замест гэтага цяпер чуюцца іншыя спрэчкі—аб Англіі, Кітаі, вытворчым жыцьці комсамольскай этыкі. Ёсьць сярод рабочых шмат няпісьменных, якія дзякуючы чытаньням ужо зацікавіліся газэтай. Чытка дае добрыя вынікі. Комсамольцы іншых фабрык і заводаў, скарыстайце газэту ў сваёй штодзённай працы!

Савіцкі

Апавяшчэньні.

У панядзелак 6 чэрвеня ячэйка працаўнікоў мастацтва сумесна з беспартыйнай моладзьдзю наладжвае катаньне на лодках з справаздачай экскурсантаў, ехаўшых у Ленінград.

Збор а 6 гадзіне каля Белдзяржтэатру.

Згублены.

○ **Сяброўскі білет № 538000 выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ на імя Краскоўскага. Лічыць страціўшым моц.**

○ Сяброўскі комсамольскі білет № 35445 на імя **Кагана М. Б.**, выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

○ Сяброўскі комсамольскі білет на імя **Шыфрына З. А.**, выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

○ Сяброўскі білет № 7726 на імя **Найдовіча Я.**, выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

○ Сяброўскі білет № 919, выдадзены Менакругкомам на імя **П. Каган.**

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

НАВУКА І ЖЫЦЬЦЁ.

МАРЫ СТАНОВЯЦЦА САПРАЎДНАСЬЦЮ

Малюнкі па радыё.

Нядаўна ў савецкім друку зьявілася важнае і цікавае паведамленьне: „Расійскім інжынэрам **А. Ф. Шорыным** у цэнтральнай лябараторыі трэстаў слабога току ў Ленінградзе вынайдзен **першы ў СССР апарат для перадачы па радыё і тэлеграфу штрыхавых малюнкаў.** Зараз трэст прыступае да масавага вырабу такіх апаратаў, спадзяючыся давесьці іх кошт да кошту звычайных лямпавых прыемнікаў“.

Партрэт У. І. Леніна, перададзены па радыё па спосабу Шорына.

Гэтыя кароценькія радкі кажуць аб вялізэзным вынаходжаньні, якое рэзка зьменіць усё нашае жыцьцё, зьменіць ня менш, чым зьмяніла так нечакана радыё. Сапраўды, гэта-ж азначае, што мы аднолькава лёгка будзем ня толькі слухаць, але і бачыць па радыё, тэлеграфу і тэлефону. Гэта значыць, што слухаючы на вечарох концэрт, які перадаецца па радыё, мы на асобым экране ў нашым пакоі забачым артыстых; слухаючы прамовы на зьездзе саветаў, забачым прамоўцаў і вялізэзную залю; слухаючы опэру, забачым сцэну і г. д. і г. д. Цяжка зараз нават уявіць сабе, што абяцае нам вынаходжаньне інжынэра Шорына.

Як-жа вынашлі такі апарат? На грунце чаго зроблена такое вынаходжаньне? Трэба сказаць, што стварэньне такога роду апаратаў і ў нас, і за мяжою даволі складна, хаця за апошні час спэцыялістыя прымаюць усе меры да таго, каб спрасьціць іх.

Пачнем з **перадаючага апарату**. Увесь сэнс яго працы састаіць ў тым, каб перадаваемую карціну, правільней кожны маленькі кавалак гэтай карціны ператварыць у электрычны ток, у электрычныя сігналы, а гэтыя сігналы перадаць па радыё, тэлеграфу ці тэлефону ў **прымаючы апарат**. Гэта дасягаецца пры дапамозе асобай матэрыі—„**селена**“. „Селен“ уладае орыгінальнай уласьцівасьцю прапушчаць праз сябе электрычны ток, але прапушчаць неаднолькава, у залежнасьці ад таго, як ён асьвятляю—сільна ці слаба.

Прамень сьвету, праходзячы паступова праз кожны маленькі кавалак перадаваемай карціны, падае на селенавы пласток. Ад гэтага пласток па рознаму асьвятляецца: калі прамень сьвету праходзіць у гэты момант праз цёмную частку карціны, яна асьвятляецца слабее, калі праз сьветлы — мацней. Селенавы пласток, па рознаму асьвятляючыся, па рознаму прапушчае праз сябе электрычны ток, і такім чынам, пасылае розныя электрычныя сігналы, як-бы пераводзячы карціну на „электрычную мову“. Гэтыя сігналы перадаюцца ў прымаючы апарат. Тут адбываецца наадваротная работа: электрычныя сігналы ператвараюцца ў сьветавыя, а яны - у перадаваемую карціну. Гэта робіцца такім чынам: атрыманыя ў прымаючым апарапе электрычныя сігналы рознай сілы розна (г. зн. тускла, ці ярка) запаляюць электрычную лямпу, якая адкідвае свой сьвет праз маленькую адтуліну на фотографічны пласток, які рушыцца пад адтулінай таксама, як рушылася карціна ў перадаючым апараце. Такім чынам, мы хутка атрымоўваем фотографічны здымак таго малюнку, які нам перадалі быць можа за сотні і тысячы вёрст.

Вось у грубых рысах адзін з спосабаў гэтай цікавай перадачы малюнкаў на адлегласьць. Акрамя таго, існуе яшчэ цэлы шэраг спосабаў, але ў самым асноўным яны аднолькавы—усе яны грунтуюцца на ўжо вядомай нам якасьці селена.

Так паступова адна за другой ператвараюцца ў сапраўднасьць вядаўныя мары і фантазыі чалавецтва.

„Кашачае вока“.

Да апошняга часу тэхніка, ня гледзячы на ўсе стараньні, не змагла дабіцца таго, што прыродай дадзена кошцы: **бачыць у цемнаце.** Асабліва гэтага дабіваецца ваенная тэхніка. Пры позыцыйнай вайне, якая зараз вядзецца, надзвычайна важна ў час заўважыць падкрадваючагася ворага, каб ня быць раптам засьцігнутым начной атакай... Праўда, некаторыя спосабы для гэтага існавалі: магчыма была сачыць за ворагам праменьнямі прожэктараў, ці абстрэльваць яго сьветавымі гранатамі. Але той і другі спосабы ня былі дастаткова добрыя: яны заўсёды даскана ла вызначалі наша ўласнае месца. Бачыць-жа і ня быць заўважаным не ўдавалася.

Апошнія чужаземныя часопісі прынесьлі цікавае паведамленьне з Францыі аб тым, што аднаму вучонаму ўдалося вынайсьці асобы прыбор— ён назваў яго „кашачае вока“,— які **надзвычайна добра бачыць у цемнаце.** Пабудаваньне гэтага „вока“ аснована на працы нябачных так званых інфачырвоных *) праменьняў. Па свайму надворкаму віду ён уяўляе з сябе цёмны прожэктар, які на асобым маленькім экране дае ноччу яскравы малюнак таго, што адбываецца ў тым напраўленьні, куды ён накіраван.

Гэта вынаходжаньне прынята французкім ваенным міністэрствам.

Жывёлы слухаюць музыку

У Лёнданскім зоолёгічным садзе нядаўна былі праведзены дасьледваньні з мэтай высьніць уплыў, які аказвае музыка на розных жывёл. Дасьледваньні далі цікавы матар'ял.

На розных жывёл музыка ўтварае рознае ўражаньне. На гадзін, напрыклад, музыка ня робіць ніякога ўплыву. А вось кракадзілы і марскія львы—вельмі хваляваліся, калі слухалі музычныя гукі... Пры вопытах яны кідалі ўсе свае заняткі, нават яду і таўпіліся каля сьценкі клеткі, недалёка ад аркестру. Шматлікавыя вопыты паказалі, што іх больш усяго прываблівае спакойная музыка.

Паміж іншым, цікава адзначыць, што ў Амэрыцы нядаўна была выпушчана спэцыяльная лавушка для камароў, якая ўладае здольнасьцю іспускаць ноты вызначанай высаты. Камары, прываблены гэтымі гукамі, нападаюць у сетку і забіваюцца электрычным разрадам..

«Кашачае вока».

*) Так называюцца тыя праменьні, на якія распадаецца сонечнае праменьне і якія нябачны нашым вокам.

Галоўлітбел № 24867 Менск, 2 друкарня БДВ.